УДК 94(476) “1921/1939”

*А.М. Вабішчэвіч*

# ЭТНАПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІМ РЭГІЁНЕ Ў 1921–1939 гг.: КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ ПАЗІЦЫІ Ў ВЫВУЧЭННІ ПРАБЛЕМАТЫКІ

У артыкуле аўтарам выкарыстаны вынікі ўласных даследаванняў па этнапалітычнай праблематыцы Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). Выдзелены найбольш значныя канцэптуальныя навуковыя пазіцыі ў вывучэнні нацыянальна-культурнага жыцця грамадства ў заходнебеларускім рэгіёне ў складзе Польскай дзяржавы, якія неабходны для разумення складаных этнапалітычных працэсаў у заходніх абласцях БССР у 1939–1941 гг., у час Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваеннае дзесяцігоддзе. Прызнана неабходным спалучэнне беларусацэнтрычнага і поліэтнічнага падыходаў пры даследаванні дадзенай тэмы. У абагуленым выглядзе выкладзены асноўныя высновы прац аўтара, у якіх вызначана асіміляцыйна-абмежавальная накіраванасць нацыянальнай палітыкі польскіх улад адносна беларусаў і яе незавершаны характар, выяўлены паланізатарскі змест дзейнасці польскіх грамадскіх структур на заходнебеларускіх землях, устаноўлена тыпалогія міжэтнічных культурных узаемаадносін.

Хоць гісторыя Заходняй Беларусі 1920–30-х гг. ужо некалькі дзесяцігоддзяў з’яўляецца аб’ектам даследаванняў айчынных вучоных, аднак этнапалітычныя працэсы сталі прадметам аб’ектыўных навуковых даследаванняў толькі на сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі Беларусі. За выключэннем дысертацый, манаграфічных прац, вынікі гэтых даследаванняў пакуль яшчэ недастаткова адлюстраваны ў агульнадаступнай навуковай і асабліва вучэбнай літаратуры. Таму асноўнай мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца прадстаўленне асноўных, ключавых пазіцый па гэтай праблематыцы, якія распрацоўваліся аўтарам дадзенага артыкула на працягу апошняга часу і маюць канцэптуальнае значэнне для беларускай гістарыяграфіі. Неабходнасць азнаямлення з імі выклікана пашырэннем у сучасных умовах у грамадскай свядомасці (асабліва праз віртуальную прастору) пэўных запазычаных стэрэатыпаў, якія даюць скажонае ўяўленне гістарычнай ісціны аб заходнебеларускай рэчаіснасці перыяду паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі.

Для разумення этнапалітычных працэсаў на заходнебеларускіх землях важнае значэнне маюць наступныя канцэптуальныя пазіцыі, якія былі намі абгрунтаваны ў шэрагу навуковых прац: існавалі глыбокія разыходжанні паміж міжнародна-прававымі абавязацельствамі, канстытуцыйнымі гарантыямі Польскай дзяржавы і рэальнай практыкай яе нацыянальнай палітыкі; у адносінах да беларусаў (як і да іншага няпольскага насельніцтва) польскімі ўладамі праводзілася не проста паланізацыя, а асіміляцыя, аднак яна не была канчаткова рэалізавана.

Прававую аснову для наладжвання культурнага жыцця розных этнасаў у межах Польшчы складалі яе міжнародныя абавязацельствы, прынятыя ў межах шэрагу адпаведных дагавораў Версальскай сістэмы і пасля завяршэння польска-савецкай вайны 1919–1920 гг., а таксама ўнутранае заканадаўства. Гарантыі ў галіне культуры і асветы былі прадугледжаны Дагаворам аб абароне нацыянальных меншасцей (Малым Версальскім трактатам), падпісаным польскім урадам 28 чэрвеня 1919 г., які ўтрымліваў як агульныя палажэнні, так і канкрэтныя абавязацельствы. Аднак недасканаласць Версальскай сістэмы не дазволіла наладзіць эфектыўны механізм абароны нацыянальных меншасцей на міжнародным узроўні [1, с. 17]. Умовы Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. таксама гарантавалі нацыянальнае раўнапраўе, свабоду развіцця культу-

ры, мовы, стварэння таварыстваў. Адпаведныя юрыдычныя нормы гарантаваліся і ўнутраным заканадаўствам Польшчы. Канстытуцыя 1921 г. выключала любую дыскрымінацыю на падставе адметнасцей культуры, веравызнання, мовы, дэкларавала ўсім нацыянальным супольнасцям роўныя правы з палякамі пры адкрыцці за ўласны кошт розных адукацыйных, грамадскіх і іншых установ, свабоднае выкарыстанне ў іх нацыянальных моў, рэлігійнай практыкі (артыкулы 108–111). Правы нацыянальных меншасцей былі замацаваны і канстытуцыяй Польшчы 1935 г.

Аднак тэорыя і рэальная практыка ажыццяўлення дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі ў міжваеннай Польшчы адрознівалася. У 1920-я гг. польскія ідэолагі давалі спрошчанае ўяўленне пра беларусаў як этнічнай масе, якая лёгка паддаецца знешнім уплывам, інертнай, з несфармаванай нацыянальнай свядомасцю. У першай палове 1920-х гг. у нацыянальнай палітыцы польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі на ўзбраенне былі ўзяты тэарэтыка-ідэалагічныя палажэнні польскіх нацыянал-дэмакратаў, якія прадугледжвалі выключна польскі характар культурнага жыцця, нацыянальную асіміляцыю беларусаў.

Абвешчаны рэжымам «санацыі» Ю. Пілсудскага пераход да палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі, калі замест адстойвання выключна інтарэсаў польскай нацыі дэклараваўся прыярытэт інтарэсаў Польскай дзяржавы, Айчыны для ўсіх грамадзян незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці, быў запланаваны яшчэ да майскага (1926 г.) дзяржаўнага перавароту ў Польшчы. Аднак змены ў нацыянальнай палітыцы (замест палітыкі нацыянальнай асіміляцыі – палітыка дзяржаўнай асіміляцыі) закранулі толькі форму, метады яе рэалізацыі і не выправілі мэтавай накіраванасці на асіміляцыю. Рэжым «санацыі» не адмовіўся ад самой ідэі паланізацыі заходнебеларускіх зямель. Польская мова павінна была стаць пануючай ва ўсіх органах дзяржаўнага і мясцовага кіравання, сферы адукацыі. Паводле кіраўніка ўсходняга аддзела міністэрства замежных спраў Польшчы Т. Галуўкі, вялікадзяржаўныя інтарэсы дыктавалі ўмацаванне на «крэсах» не толькі польскай дзяржаўнасці, але і польскай культуры [2, с. 175]. Непрацяглыя ўступкі мелі абмежаванае і выбарачнае фінансавае забеспячэнне, якое ставілася ў прамую залежнасць ад палітычнай лаяльнасці. Пад уплывам шэрагу фактараў: палітычных (узмацненне аўтарытарнай тэндэнцыі ва ўнутранай палітыцы Польшчы; актывізацыя заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху); сацыяльна-эканамічных (нявырашанасць аграрнага пытання; абвастрэнне сацыяльнай напружанасці); этнапсіхалагічных (агульнапольскі патрыятычны ўздым, пашырэнне нацыяналістычных настрояў) – пасля непрацяглага і эпізадычнага выкарыстання больш памяркоўных і завуаліраваных ліберальна-дэмакратычных палажэнняў з канца 1920-х гг. фактычна адбылося вяртанне да папярэдняй палітыкі нацыянальнай асіміляцыі, хоць афіцыйнай працягвала лічыцца палітыка дзяржаўнай асіміляцыі [3, с. 111]. Усё гэта суправаджалася рэпрэсіўнымі мерамі супраць заходнебеларускіх арганізацый, друку, навучальных устаноў. А ў пачатку 1930-х гг. аўтарытарны рэжым «санацыі» ажыццявіў шэраг мер па абмежаванні грамадзянскіх правоў і свабод. У ходзе праведзенай у 1932 г. рэформы адукацыі ўзмацнілася палітыка-ідэалагічная накіраванасць вучэбна-выхаваўчага працэсу.

З сярэдзіны 1930-х гг. у кіруючым лагеры пілсудчыкаў выразнымі сталі клерыкальныя, нацыяналістычныя і таталітарныя погляды, што адбілася і на ўрадавай нацыянальнай палітыцы. Асобныя аддзелы міністэрства ўнутраных спраў Польшчы займаліся самастойнай выпрацоўкай праектаў паскарэння інтэграцыі «ўсходніх крэсаў». Хоць польскія кіруючыя колы не лічылі беларускае пытанне пагражальным для дзяржаўных інтарэсаў, аднак на працягу 1936–1938 гг. быў прыняты цэлы комплекс рэпрэсіўных мер:

прыступілі да канчатковай ліквідацыі нешматлікіх беларускіх школ, арганізацый, газет, да поўнага падпарадкавання і кантролю з боку адміністрацыйна-паліцэйскіх органаў любой грамадскай дзейнасці [4, с. 67–69]. Актывізацыя асіміляцыйных дзеянняў польскіх улад, з аднаго боку, сведчыла аб паскарэнні разбуральных этнапалітычных працэсаў, з другога – аб недастатковай выніковасці папярэдніх (да сярэдзіны 1930-х гг.) крокаў у напрамку паланізацыі і асіміляцыі беларусаў. Аднак дзякуючы выкарыстанню разнастайных унутраных і знешніх рэсурсаў яны здолелі самазахавацца і пазбегнуць поўнай страты этнічнай і культурнай ідэнтычнасці.

Этнаканфесійная спецыфіка заходнебеларускага краю, дзе спрадвеку суіснавалі прадстаўнікі розных этнасаў і канфесій, прадугледжвае пры вывучэнні этнапалітычных працэсаў 1920–30-х гг. спалучэнне беларусацэнтрычнага і поліэтнічнага падыходаў. Акрамя беларусаў, якія складалі большасць насельніцтва, у дадзеным рэгіёне былі і палякі, яўрэі, рускія, украінцы, літоўцы, татары і іншыя нацыянальныя супольнасці.

У межах Польскай дзяржавы палякі сталі пануючым этнасам, атрымалі прывілеяванае месца ў вядучых сферах грамадскага жыцця. У адрозненне ад беларусаў і іншых нацыянальных супольнасцей палякі мелі асобны сацыяльны статус, які быў прадвызначаны іх становішчам тытульнага этнасу Польскай дзяржавы [5, с. 129].

Большасць польскіх і беларускіх гісторыкаў лічыць палякаў аўтахтонным насельніцтвам на тэрыторыі Беларусі. Аднак нярэдка польскія вучоныя не хочуць прызнаваць таго, што польскае насельніцтва папаўнялася за кошт асіміляванага беларускага. Хоць у асобных працах сцвярджаецца, што ў фарміраванні польскага насельніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі галоўным быў фактар перасяленняў, аднак большасць беларускіх даследчыкаў (як і частка польскіх вучоных) справядліва прызнае ў гэтай справе прыярытэт паланізацыі і самапаланізацыі карэннага насельніцтва. Павелічэнне колькасці палякаў у заходнебеларускім рэгіёне адбывалася і пры дапамозе яе каланізацыі з цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы, і асабліва за кошт мясцовага няпольскага (пераважна беларускага) насельніцтва, у адносінах да якога праводзілася мэтанакіраваная паланізацыя і асіміляцыя.

Ва ўмовах вострых сацыяльна-эканамічных супярэчнасцей, прывілеяванага стану палякаў і пад уплывам дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі складваліся перадумовы для напружання і канфліктаў у міжнацыянальных і міжкультурных адносінах. Асноўныя па значнасці беларуска-польскія стасункі з'яўляліся пераважна канфрантацыйнымі (нярэдка канфліктнымі), што было прадвызначана грамадска-палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі, канфесіянальнымі, этнапсіхалагічнымі і іншымі фактарамі, ключавымі пазіцыямі палякаў у грамадскім жыцці. Падобны характар адносін мелі палякі з усходнеславянскімі супольнасцямі (рускімі, украінцамі), літоўцамі. Частка няпольскага насельніцтва (яўрэі, татары, стараабраднікі) імкнулася праяўляць лаяльнасць і адаптавацца да польскай дзяржаўна-палітычнай сістэмы: яе адносіны з палякамі характарызаваліся суіснаваннем і супрацоўніцтвам. Больш напружаным было суіснаванне ў грамадска-культурнай сферы палякаў і яўрэяў. Беларуская большасць падтрымлівала пераважна пазітыўныя міжкультурныя кантакты з іншымі нацыянальнымі супольнасцямі [3, с. 116].

Вывучэнне дзейнасці разнастайных грамадскіх структур (устаноў, грамадскіх арганізацый і інш.) польскай супольнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі дазваляе вылучыць іх мэтавую накіраванасць на прапаганду дзяржаўнай ідэалогіі, узмацненне пазіцыі культуры мясцовых («крэсовых») палякаў і асіміляцыю беларусаў, іншых нацыянальных супольнасцей.

Сетка дзяржаўных польскіх навучальных устаноў, прадстаўленых у асноўным пачатковымі і сярэднімі школамі, была нацэлена не столькі на задавальненне адукацыйных патрэбаў мясцовых палякаў, колькі на паланізацыю беларускай большасці. Ва ўмовах няздольнасці польскіх улад стварыць неабходную сацыяльна-культурную інфраструктуру выкарыстоўваліся магчымасці органаў мясцовага самакіравання, грамадскіх арганізацый. Грамадскія арганізацыі абмяжоўваліся пераважна пытаннямі ліквідацыі непісьменнасці, простымі і агульнадаступнымі формамі культурна-асветніцкай працы, якую разгортвалі ў асноўным у клубах (святліцах). Сярод іх галоўную ролю выконвалі грамадска-палітычныя маладзёжныя, жаночыя аб’яднанні праўрадавай арыентацыі, арганізацыі польскіх каланістаў. Створаны ў 1919 г. Стралецкі саюз надаваў выключнае значэнне культурна-асветніцкай і выхаваўчай працы сярод «крэсовай» моладзі ў форме розных канферэнцый, лекцый, тэатральна-мастацкіх паказаў, кінасеансаў, экскурсій, пры дапамозе бібліятэк, чытальняў, курсаў, выдавецкай прадукцыі [6, с. 73]. Культурна-асветніцкай працай сярод моладзі ў сельскай мясцовасці займалася яшчэ адна арганізацыя праўрадавай арыентацыі – Саюз вясковай моладзі. Акрамя гаспадарчай праблематыкі, у праграму асветніцкай дзейнасці гурткоў вясковых гаспадынь уключаліся лекцыі грамадска-палітычнай тэматыкі, напрыклад, аб адраджэнні Ю. Пілсудскім польскай дзяржаўнасці і інш.

Створаная яшчэ ў 1905 г., Польска мацеж школьна (ПМШ) у пачатку 1920-х гг. прадэкларавала адну з галоўных задач – распаўсюджванне і паглыбленне ўплыву польскай культуры на «ўсходніх крэсах», найперш шляхам ліквідацыі непісьменнасці, малапісьменнасці моладзі і дарослага насельніцтва. Толькі ў Палескім ваяводстве ў канцы 1938 г. дзейнічалі 116 польскіх пачатковых школ ПМШ [7, с. 31]. Навучанне там праходзілі ў асноўным дзеці польскіх каланістаў і чыноўнікаў.

Для вырашэння сацыяльна-культурных праблем пры падтрымцы ўрадавых структур у 1933 г. былі створаны новыя аб’яднанні: Таварыства падтрымкі будаўніцтва грамадскіх пачатковых школ, а таксама Таварыства развіцця ўсходніх зямель, якое выступала за пашырэнне польскай культуры, абарону і развіццё рэгіянальных каштоўнасцей, правядзенне выхаваўчай, культурна-асветніцкай, навукова-даследчай працы. Да культурна-асветніцкай працы прыцягваліся і аддзелы Саюза пажарнай аховы. Апалітычныя па сваім характары, яны з’яўляліся зручнымі для польскіх улад, якія планавалі выкарыстаць іх культурна-асветніцкую дзейнасць для правядзення паланізацыі. Такім чынам, не толькі грамадска-палітычныя, культурна-асветніцкія арганізацыі, але і фармальна апалітычныя (рэлігійныя, жаночыя, пажарныя і інш.) аб’яднанні былі скіраваны на паланізацыю.

У другой палове 1930-х гг. ва ўмовах ліквідацыі грамадскіх арганізацый беларусаў і іншых нацыянальных супольнасцей прадугледжвалася фарсіраванне дзейнасці польскіх аб’яднанняў. Для паскарэння паланізацыі беластоцкі ваявода, напрыклад, прапаноўваў стварыць пад кантролем улад разгалінаваную сетку польскіх культурна-асветніцкіх цэнтраў, наладзіць каардынацыю дзейнасці ўсіх польскіх грамадскіх арганізацый [8, арк. 51, 153]. Меркавалася пашырыць ўплыў праўрадавых і асабліва фармальна апалітычных аб’яднанняў за кошт сацыяльнай базы забароненых беларускіх культурна-асветніцкіх арганізацый (Таварыства беларускай школы, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры і інш.).

Аб ступені нацыянальна-культурнай асіміляцыі беларускага насельніцтва сведчаць як статыстычныя матэрыялы, так і працы польскіх вучоных. Даследаванне польскага этнасацыёлага С. Віславуха [4] паказала, што праваслаўныя беларусы ў вёсках

аказаліся больш устойлівымі да паланізацыі: яны актыўна цягнуліся да беларускай культуры. У пераважна праваслаўных мясцовасцях шасці паўночна-ўсходніх і ўсходніх паветаў Віленскага ваяводства вынікі паланізацыі ім зафіксаваны ў 15–20% мясцовасцей, размешчаных каля гарадоў. На астатняй тэрыторыі больш трывалыя пазіцыі належалі беларускаму культурна-моўнаму асяроддзю. У ходзе адзначанага даследавання адначасова вылучаліся недаверлівыя, варожыя адносіны праваслаўных беларусаў да Польскай дзяржавы, іх прасавецкія настроі [4, с. 71].

Асіміляцыя была і сродкам рэалізацыі нацыянальна-культурнай палітыкі, і канчатковай мэтай, закліканай прывесці да незваротных этнатрансфармацыйных змен і знікнення беларускага этнасу. Пры захаванні і ўзмацненні ролі дзяржаўных і іншых сацыяльных інстытутаў Польшчы, а таксама пры гіпатэтычнай ўмове прагрэсіўнага развіцця Заходняй Беларусі ў гаспадарчай, сацыяльна-культурнай сферах асіміляцыйныя працэсы мелі рэальную перспектыву набыць канчатковы, незваротны характар. Аднак у канцы 1930-х гг., нягледзячы на ліквідацыю польскімі ўладамі арганізаваных сацыяльна-палітычных структур, беларускае насельніцтва ўсё-такі на нізавым узроўні працягвала захоўваць этнаканфесіянальныя традыцыі, мову, здольнасць да абароны ўласных сацыяльных і нацыянальных правоў.

Акрамя ўнутраных фактараў, немалое значэнне для самазахавання беларускага этнаса ў складзе Польскай дзяржавы меў уплыў грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных працэсаў ва ўсходняй (савецкай) частцы Беларусі. З боку БССР аказвалася арганізацыйная, ідэалагічна-прапагандысцкая, вучэбна-метадычная, фінансавая дапамога. Акрамя матэрыяльнай дапамогі, немалаважным быў дабратворны маральна-псіхалагічны ўплыў з боку БССР, дзе будаваўся «адзіны беларускі дом». Асабліва гэты фактар адчуваўся ў 1920-я гг. Прызнаючы значнасць савецкага ўплыву, нельга пры гэтым падвяргаць сумненню самастойнасць заходнебеларускага руху. Тым больш што з канца 1920-х гг. матэрыяльная дапамога аказвалася выбарачна і толькі прасавецкаму крылу заходнебеларускага руху. Польскім уладам было вельмі зручна абсалютызаваць дапамогу з усходу, паказваць яе праз прызму бальшавіцкай пагрозы, каб у польскай і заходнееўрапейскай грамадскасці замацаваўся стэрэатып заходнебеларускага руху як несамастойнага, інспіраванага з боку СССР [9, с. 32]. Значнасць беларускага пытання ў міжваеннай Польшчы недаацэньвалася, яго прызнавалі ў якасці рэгіянальнага.

У цэлым праведзены агляд атрыманых вынікаў даследавання этнапалітычных працэсаў у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. паказаў, што яны маюць важнае значэнне для стварэння цэласнай навуковай карціны грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця гэтай раз’яднанай часткі беларускай нацыі ў складзе Польскай дзяржавы ў акрэслены храналагічны перыяд.

Прынцыповымі для айчыннай гістарыяграфіі з’яўляюцца высновы аб стратэгічнай і тактычнай нацэленасці палітыкі польскіх улад на нацыянальна-культурную асіміляцыю беларусаў і прызнанне яе незавершанага характару, аб паланізатарскім змесце сацыякультурнай дзейнасці польскай супольнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі, аб тыпалогіі міжэтнічных культурных стасункаў. Яны могуць быць запатрабаванымі для правядзення далейшых навуковых даследаванняў: пры вывучэнні складаных этнапалітычных працэсаў у заходніх абласцях БССР ў 1939–1941 гг., пытанняў калабарацыі і дзейнасці нацыянальных узброеных фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны, саветызацыі, барацьбы з антысавецкім падполлем у рэспубліцы ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе і інш.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Вабішчэвіч, А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А.М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2008. – 319 с.
2. Paruch, W. Od konsolidacji państwowej do konsolidacji narodowej: mniejszości narodowe w myśli politycznej obozu piłsudczykowskiego (1926–1939) / W. Paruch. – Lublin : Wyd-wo UMCS, 1997. – 424 s.
3. Вабішчэвіч, А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): праблемы перыядызацыі, тыпалогіі ўзаемаадносін / А.М. Вабішчэвіч // Веснік Брэсц. ун-та. Сер. гуманіт. і грамад. навук. – 2009. – № 4 (39). – С. 110–118.
4. Вабішчэвіч, А.М. Паміж паланізацыяй і асіміляцыяй: этнакультурная сітуацыя ў Заходняй Беларусі ў другой палове 1930-х гадоў / А.М. Вабішчэвіч // Беларуская думка. – 2009. – № 7. – С. 66–71.
5. Вабішчэвіч, А.М. Спецыфіка становішча палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / А.М. Вабішчэвіч // Известия Гомел. гос. ун-та имени Ф. Скорины. – 2008. – № 4 (49). – С. 124–131.
6. Вабішчэвіч, А.М. Польскія грамадскія арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. / А.М. Вабішчэвіч // Весці Нац. акадэміі навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2008. – № 3. – С. 72–78.
7. Вабішчэвіч, А.М. Дзейнасць арганізацыі «Polska macierz szkolna» ў Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст. / А.М. Вабішчэвіч // Веснік Брэсц. ўн-та. Сер. гуманіт. і грамад. навук. – 2007. – № 2 (29). – С. 26–32.
8. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1574.
9. Вабищевич, А.Н. «Доллары пришлём через Соню…»: советский фактор в жизни западных белорусов до 1939 г. / А.Н. Вабищевич // Родина. – 2009. – № 8. – С. 30–33.

***Vabishchevich A.M.*** **Ethno-political Processes in the Western Belarus in 1921–1939: Conceptual Positions in studying issues**

In the article the author used the results of their own research on the ethno-political problems of Western Belarus (1921–1939). Deemed necessary combination belarusatsentric and multiethnic approaches in the study. Is a summary of the main conclusions of the author, which are defined in the assimilation of restrictive national policies of the Polish authorities in respect of the Belarusians and its incomplete nature, expressed polonization of the activity of the Polish social structures in the Western Belarus, established a typology of ethnic cultural relations.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 30.10.2014